ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

АРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
16
КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 25 (1511)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
*ЎЧОРА • СЁННЯ • ЗАЎТРА*

### Адзіны камсамольскі дзень

пройдзе ва ўсіх камсамольскіх групах 19 кастрычніка. На парадку дня: справаздача аб рабоце камсамольскага бюро і задачы камсамольскай арганізацыі па рэалізацыі рашэнняў XXVII з'езда КПСС і дастойнай сустрэчы XX з'езда ВЛКСМ. Адбудзецца атэстацыя па грамадска-палітычнай практыцы.

А. ГУТАВЕЦ,
намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.

### Астранамічная секцыя

Мінскага аддзялення УАГТ, навуковае студэнцкае таварыства «Сусвет» з наступнай серады праводзяць вечары, прысвечаныя абмеркаванню сучасных праблем навукі аб сусвеце.

А. СЦЯПАНАЎ.

### Да ўвагі

выкладчыкаў і студэнтаў! Кніжны кіёск, які размешчаны ў галоўным корпусе БДУ, а таксама Цэнтральны кніжны магазін — апорны пункт выдавецтва «Універсітэцкае» — у шырокім асартыменце прапаноўваюць разнастайныя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі апошніх гадоў выдання. Яны акажуць вам дапамогу на працягу вучэбнага года і ў самастойнай рабоце.

Т. РУДКОЎСКАЯ.

### Фільматэка

Белдзяржуніверсітэта запрашае выкладчыкаў і супрацоўнікаў пазнаёміцца і карыстацца новымі паступленнямі 1986 года.

А. КУТАСАЎ,
загадчык лабараторыі ТСН.

### Студэнцкі клуб

запрашае ўсіх жадаючых у гурткі і калектывы мастацкай самадзейнасці. А іменна:
— народны аркестр народных інструментаў;
— народны ансамбль танца «Крыжачок»;
— народную хараву капэлу;
— народную агітбрыгаду;
— народны студэнцкі тэатр;
— народны хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў;
— народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш»;
— ансамбль бальнага танца;
— інтэрнацыянальны ансамбль танца;
— ансамбль пантамімы;
— гуртток «Кройкі і шыцця»;
— гурток вязання.

Запіс праводзіцца ў галоўным корпусе, аўдыторыя № 401 з 10 да 16.00 гадзін.

М. ТАРАСАВА,
мастацкі кіраўнік клуба.



## ГАТОЎНАСЦЬ

### ЗА ВУЧОБУ!

— БАТАРЭЯ, пад'ём! Баявая трывога!

У адзін момант коўдры адлятаюць некуды далёка-далёка, рукі механічна цягнуцца да абмундзіравання, у рэчмяшок ляцяць ручнік, зубная паста, усе астатнія прылады, без якіх салдат — не салдат.

...Мінута, яшчэ адна, батарэя ўжо ў парку. Праразаючы цемру фарамі, машыны выцягваюцца ў калону. Сяргей Грынцэвіч ужо настроіў сваю радыёстанцыю, яго машына да маршу гатова...

Колькі разоў пасля звальнення гэтыя прывычныя да болю дзеянні па баявой трывозе прыходзілі на памяць былым вайскоўцам? Студэнт другога курса факультэта радыёфізікі і электронікі Сяргей Грынцэвіч не лічыў, але ўпэўнены, што і сёння, калі б спатрэбілася, падрыхтаваў сваю радыёстанцыю да работы без затрымкі. І справа не толькі ў тым, што яго вайсковая спецыяльнасць вельмі блізкая да грамадзянскай.

Да арміі Сяргей закончыў радыётэхнічны тэхнікум, першы курс універсітэта. Пасля арміі ў саставе факультэцкага будатрада паспеў папрацаваць на будаўніцтве дамоў для жыхароў, пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Была армія, была праца. Сёння Сяргей Грынцэвіч, як і дзесяткі іншых вайскоўцаў, уліўся ва універсітэцкі калектыў, зноў, як і два гады назад, слухае і канспектуе лекцыі, выконвае лабараторныя і чытае любімыя кнігі. Ён можа і пажартаваць, і крыху пасвавольнічаць. Але не прайшлі гэтыя два гады для яго дарэмна. Сяргей Грынцэвіч, як і ўсе тыя, хто вярнуўся на родныя факультэты, цяпер увесь час знаходзіцца ў такім стане, калі чалавек у любы момант гатовы выконваць адказную задачу.

*С. ПЛЫТКЕВІЧ.*
*Фота АЎТАРА.*

**ТЫСЯЧА І АДЗІН РЭЦЭПТ ТВАЙГО АДПАЧЫНКУ** ... Усё пачалося з цяжкасцей...

# «ВЫБІРАЕМ СТУДАТРАД!»

**ГАВОРАЦЬ, існуе амаль тысяча спосабаў летняга адпачынку. І кожны, выбіраючы з іх адзіны, толькі свой, мае рацыю.**

МЫ АДДАЕМ перавагу адпачынку актыўнаму і таму, не вагаючыся ні хвіліны, паехалі летам у студэнцкі атрад. Калі быць да канца сумленнымі, сумненні ўсё ж былі. І гэта зразумела, бо студатрад для нас справа новая, незнаёмая: «Хто ж яго ведае, як упершыню атрымаецца?»

І сапраўды, усё пачалося з цяжкасцей. У першыя дні работы здавалася, што ўсе нашы сілы застаюцца ў полі, сярод самых сапраўдных баклажанавых гор, якія стваралiся за дзень рукамі байцоў сельскагаспадарчага атрада «Алеся», і незлічонай колькасці скрынак з цыбуляй і памідорамі, якія мы грузілі на машыны. Потым высветлілася, што пасля заканчэння працоўнага дня мы былі яшчэ здольнымі прымаць актыўны ўдзел у спаборніцтвах на спартыўным фестывалі. І рыхтаваць да паказу самыя цікавыя нумары канцэртнай праграмы, на якой гледачамі станавіліся ўсе жыхары незвычайнага інтэрнацыянальнага лагера-гарадка «Дружба-86», што схаваўся сярод высокіх асілкаў-дубоў у вёсцы Старыя Дубасары.

«Алеся» мае поўнае права лічыць сябе адным з самых дружных і вясёлых атрадаў. Гэта мы зразумелі, папрацаваўшы некалькі дзён. А спачатку і самім здавалася, што дасягнуць такога ўзаемаразумення будзе цяжка — байцы атрада былі з розных факультэтаў: хімічнага, міжнароднага аддзялення факультэта журналістыкі і падрыхтоўчага аддзялення універсітэта. Але дастаткова было хоць аднойчы ўбачыць, як кіравала працай у полі камандзір Марына Чарствова, з якім запалам выконвала кожную справу камісар Наташа Кайдак, каб адразу пераканацца ў адваротным.

Засталіся ў памяці вогнішчы з гітарным пераборам і песнямі аб сяброўстве і міры на розных мовах свету, сустрэчы з малдаўскай моладдзю, экскурсія ў Адэсу.

Мінула лета. Скончыўся працоўны семестр студэнтаў. У апошнія дні жніўня цягнік адвозіў нас дадому ў Мінск. І цяжка, мабыць, было адшукаць вагон, весялейшы за наш, бо ехалі ў ім людзі ў зялёных штурмоўках, якія адчувалі сапраўднае шчасце за выдатнае выкананне неабходнай і патрэбнай справы.

Так. Кожны сам вырашае, як правесці лета. Мы выбралі студатрад. І ні аднаго разу аб гэтым не пашкадавалі. Засталіся цёплыя ўспаміны пра жыццё ў «Дружбе-86» і, здаецца, ніколі не будзе канца расказам пра тое, як праходзіла мінулае лета нашага студэнцкага жыцця.

Бясмела МУМАНД,
студэнт факультэта журналістыкі.

КУРСАМ ПАСКАРЭННЯ

# «Наша першая пяцігодка»

**У жыцці любога калектыву, як і кожнага чалавека, наступаюць так званыя «круглыя даты», калі з'яўляецца неабходнасць асэнсаваць пройдзены шлях, ацаніць дасягнутыя вынікі, намеціць планы на будучае. Прыйшла такая, пакуль невялікая, першая дата і ў кароткай гісторыі кафедры кібернетыкі: пяць гадоў існавання споўнілася кафедры ў жніўні. Як жа склалася першая пяцігодка?**

*...Падводзячы вынікі нашай першай пяцігодкі, галоўным дасягненнем неабходна лічыць цудоўны псіхалагічны клімат у калектыве, яго маладосць, захопленасць выбраным напрамкам і велізарную працаздольнасць.*



НА КАФЕДРУ ўскладвалася адказная задача: падрыхтоўка спецыялістаў па такіх актуальных для рэспублікі галінах ведаў, як «аўтаматызацыя навуковых даследаванняў» і «робататэхніка». З першых жа дзён існавання кафедры яе невялікі калектыў заняў актыўную жыццёвую пазіцыю перш за ўсё таму, што прыходзілася пачынаць з нуля. Супрацоўнікі кафедры прымалі актыўны ўдзел у арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенні канферэнцый, школ-семінараў, якія праводзілі Мінскі гарком КПБ, Міністэрства вышэйшай адукацыі БССР і СССР, НВА «Гранат». Пэўную работу правяла кафедра па папулярызацыі і гэтага перспектыўнага навуковага напрамку ва універсітэце, аказала ўсебаковую дапамогу ў арганізацыі родных кафедраў і спецыялізацый на факультэтах прыкладной матэматыкі і механіка-матэматычным. Наша кафедра з'явілася ініцыятарам другога ў гісторыі універсітэта вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання з буйнейшым робатабудаўнічым прадпрыемствам краіны — НВА «Гранат». За кароткі час былі наладжаны дзелавыя кантакты з іншымі вядучымі арганізацыямі і прадпрыемствамі горада, заключаны з імі дагаворы аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. Словам, аператыўна былі створаны асновы той жыццёва важнай для маладой кафедры арганізацыйнай інфраструктуры дзелавых адносін і кантактаў, якая ў кафедраў-ветэранаў складваецца дзесяцігоддзямі.

Вучэбна-метадычная работа пасля выдзялення спецыялізацыі «Аўтаматызацыя навуковых даследаванняў» у асобную кафедру сканцэнтравалася на спецыялізацыі «Кібернетыка. Сістэмы кіравання робатаў». Пэўныя цяжкасці станаўлення вучэбнага працэсу ўскладняліся тым, што мы вядзём такую спецыялізацыю на базе трох спецыяльнасцей.

У краіне адсутнічалі аналагі нашых спецыялізацый, і пры распрацоўцы вучэбнага плана, рабочых праграм, пастаноўцы лабараторных практыкумаў працаваць прыходзілася творча і сістэматычна, спалучаючы дасягненні сусветнага і айчыннага робатабудавання. Цяпер з упэўненасцю можна сказаць, што праробленая ў гэтым напрамку работа ў цэлым удалася.

Наступным, не менш важным, але больш працаёмкім фактарам станаўлення кафедры з'явілася рэсурснае забеспячэнне вучэбна-выхаваўчага працэсу і навукова-даследчай работы. Удасканальваюцца лабараторыі «Маторыка робатаў», «Радыёэлектронныя сродкі робатаў», «Сістэмы кіравання робатаў», «Мадэліраванне робатаў» і іншыя. Паступова павялічваліся і вытворчыя плошчы кафедры. Іх усё яшчэ недастаткова і яны раскіданы ў чатырох розных месцах на першым і пятым паверхах вучэбнага корпуса, але вучэбны працэс і навукова-даследчую работу ўжо можна весці на належным ўзроўні.

Добра вядома, што аўтарытэт любой кафедры ў значнай ступені вызначаецца актуальнасцю і ўзроўнем навукова-даследчых работ. Вось чаму пастаноўцы навуковай работы калектыў кафедры надаваў і надае самую пільную ўвагу. Распрацаваны новыя канцэпцыі стварэння сістэм кіравання універсальных электрамеханічных робатаў на аснове распрацаваных на кафедры бескантактных рухавікоў пастаяннага току і мікрапрацэсарных рэгулятараў. Унікальныя эксплуатацыйныя характарыстыкі іх зацікавілі шэраг арганізацый краіны, кафедра не адчувае недахопу ў прывабных прапановах. На жаль, выкарыстаць іх ў поўнай меры перашкаджае абмежаваны фонд зарплаты па навукова-даследчых работах. За апошнія два гады, калі былі разгорнуты гэтыя работы, супрацоўнікі кафедры кібернетыкі падрыхтавалі 52 заяўкі на вынаходніцтвы, і толькі ў бягучым годзе атрымалі па іх 12 станоўчых рашэнняў. Большасць гэтых новых тэхнічных рашэнняў выкарыстаны ў ходзе выканання навукова-даследчых работ па рэспубліканскай праграме, уключаны ў новую праграму «Інтэнсіфікацыя — 90», міжведамасную праграму па робататэхніцы на 1986—1990 гады дзевяці вядучых галін прамысловасці. На 14 вынаходніцтваў у цяперашні час афармляюцца дакументы па патэнтаванню за мяжой. На міжнародны кірмаш у Гановеры кафедра рыхтуе два экспанаты. Па прапанове НВА «Гранат», пачынаючы з 1987 года кафедра правядзе не толькі НДР па распрацоўцы сістэмы кіравання робата-тэхналагічнага комплексу зваркі і механаапрацоўкі, але і вопытна-канструктарскія работы па распрацоўцы выканаўчых сістэм новага зборачнага робата.

Падводзячы вынікі нашай першай пяцігодкі, галоўным дасягненнем неабходна лічыць цудоўны псіхалагічны клімат у калектыве, яго маладосць, захопленасць выбраным напрамкам і велізарную працаздольнасць. З чатырох ленінскіх стыпендыятаў-выпускнікоў факультэта трое сталі супрацоўнікамі кафедры — асістэнт І. Шалатонін, аспіранты І. Чушанкоў, І. Парамчык. Шмат, ініцыятыўна працуюць выпускнікі кафедры аспірант С. Сідарук, загадчык лабараторыі У. Вярбіцкі, інжынер В. Кузьмянкоў, малодшы навуковы супрацоўнік В. Любецкі, інжынер І. Заплечнікаў. Далейшая актывізацыя чалавечага фактара — пастаянны клопат партгрупы нашай кафедры, яе прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый, аснова яе будучых поспехаў.

А. МІХАЛЕЎ,
загадчык кафедры кібернетыкі, доктар тэхнічных навук, прафесар.

СТУДЭНТ — КУРАТАР — КАФЕДРА

*...Група адчувае сябе калектывам, які здольны рашаць сур'ёзныя задачы.*

# Не ўхаластую

**На другім курсе ўсе студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі «разыходзяцца» па спецыялізаваных кафедрах. І першым сустракае групу на кафедры куратар.**

ІМЕННА ад яго ў многім залежыць, якой быць зноў створанай групе, ці стане яна калектывам аднадумцаў, які след пакіне на кафедры, ці складзецца ў хлопцаў і дзяўчат праўдзівае ўяўленне аб сваёй будучай прафесіі, ці стануць яны сапраўднымі спецыялістамі. Задачы складаныя. Фармальны падыход толькі перашкаджае іх вырашэнню. Патрэбны вопыт, як асабісты, так і грамадскі, замацаваны ў традыцыях кафедры. І ў нас яны ўжо сфарміраваліся.

Знаёмства студэнта з саставам кафедры, тэматыкай яе работ пачынаецца з экскурсіі па лабараторыях. Знаёмства кафедры са студэнтамі пачынаецца з выпуску імі газеты «Добры дзень, кафедра!», у якой яны расказваюць пра сябе, свае інтарэсы, захапленні. Увядзенне ў спецыяльнасці кафедры адбываецца ў цыкле гутарак «Мая будучая прафесія — радыёфізік». Куратар знаёміць студэнтаў з заканамернасцямі навуковай творчасці, навуковай арганізацыі працы. Вялікую дапамогу аказваюць пры гэтым студэнты старэйшых курсаў.

Добра зарэкамендавала сябе на кафедры практыка калектыўнага Ленінскага задання, якое даручаецца групе. Студэнты дапамагаюць кафедры ў абсталяванні вучэбных лабараторый, афармленні стэндаў. Група адчувае сябе калектывам, які здольны рашаць сур'ёзныя задачы.

Нельга забывацца і на ідэйна-выхаваўчую работу ў групе. Традыцыйнымі сталі палітінфармацыі, тэматычныя гутаркі, наведванні тэатра-студыі кінаакцёра, філармоніі, залы камернай музыкі.

Поспехі ў арганізацыі навукова-даследчай работы, стварэнні творчай атмасферы на кафедры тлумачацца добрасумленнымі адносінамі куратараў груп да сваіх правоў і абавязкаў. Ланцуг «студэнт — куратар — кафедра», калі ён непашкоджаны, добра працуе, і не ўхаластую.

І. ШАЛАТОНІН,
асістэнт.

ТВАЕ ВЫКЛАДЧЫКІ, СТУДЭНТ!

# ЖАНЧЫНА ў «мужчынскай» НАВУЦЫ

**Склалася меркаванне, што жанчыны-педагогі ў найбольшай ступені задавальняюць патрабаванні сучаснай школы сваімі ўважлівымі адносінамі да вучняў, цярпеннем і настойлівасцю ў выхаванні. Аднак жанчыны ў навуцы выклікаюць у некаторых неабгрунтаваны скептыцызм і недавер, якія з'яўляюцца, відаць, вынікам кансерватызму і архаічнасці погляду. Але як бы ні красамоўнічалі абаронцы «мужчынскай» навукі, як бы ні выхваляліся сваімі былымі заслугамі — жыццё дыктуе свае ўмовы. Зараз ні адну галіну навукі і ведаў немагчыма ўявіць без вялікага ўкладу жанчын-вучоных.**

*...Жаночая дабрыня і ўвага заспакойваюць у цяжкую мінуту, надаюць упэўненасць у сваіх сілах, у сваіх магчымасцях.*

КАФЕДРА кібернетыкі нашага універсітэта — бадай, самы яскравы прыклад выключна важнага ўкладу жанчыны ў развіццё такіх непрыступных для многіх навук, як тэорыя аўтаматычнага кіравання і нелінейных дыферэнцыяльных ураўненняў, развіццё сучаснага робатабудавання. Кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Людміла Іванаўна Мацюхіна з'яўляецца адным з вядучых спецыялістаў у галіне распрацоўкі рэгулятараў кантралюючых сістэм, аналізу і сінтэзу аўтаматычнага кіравання, стварэння матэматычных мадэляў аб'ектаў кіравання з пераменнай структурай. Яе работы ахопліваюць практычна ўсю вялікую навуковую дзейнасць кафедры. Бездакорная навуковая карэктнасць, абгрунтаванасць і лагічнасць меркаванняў абумоўліваюць трывалы аўтарытэт Людмілы Іванаўны як вучонага.

Актыўная і плённая навуковая дзейнасць спалучаецца у Л. І. Мацюхінай з вялікай грамадскай работай. Кіруемыя



ею як куратарам групы адрозніваюць асабістая зацікаўленасць у грамадскім жыцці універсітэта, факультэта, кафедры. Адказны арганізатар, Людміла Іванаўна бездакорна выконвае даручаную справу. Вопыт педагога толькі ўмацоўвае да яе глыбокі давер.

Людміла Іванаўна Мацюхіна заўсёды сярод людзей, якія ў пошуку парады, падтрымкі. Бо яна незвычайна спагадлівы чалавек. Усё яе жыццё праходзіць у жаданні дапамагчы людзям.

Жаночая дабрыня і ўвага заспакойваюць у цяжкую мінуту, надаюць упэўненасць у сваіх сілах, сваіх магчымасцях. Гэты чалавек шчыры на радасць, валодае мяккім характарам. У той жа час уражвае сваёй прынцыповасцю.

В. ЛЮБЕЦКІ,
выпускнік 1986 года.

СТУДЭНТ І НТП

# АД ВЕДАЎ — ДА НАВЫКАЎ

У падрыхтоўцы маладога спецыяліста на кафедры кібернетыкі вылучаюць тры ўзроўні. Першы — гэта валоданне неабходным аб'ёмам ведаў. Другі ўзровень складае ўменне на практыцы выкарыстоўваць свае веды. А трэці ўзровень, самы важны — уменне, якое даведзена да навыкаў. Узняць узровень падрыхтоўкі спецыяліста ад ведаў да ўмення і навыкаў — іменна ў гэтым бачаць сваю галоўную мэту выкладчыкі і супрацоўнікі кафедры. Важнае месца ў гэтым працэсе адводзіцца навукова-даследчай рабоце студэнтаў, роля якой у сённяшняй перабудове вышэйшай школы непамерна ўзрасла.

...Нягледзячы на сваю маладосць, СНДЛ мае ўжо шэраг сур'ёзных дасягненняў: толькі ў мінулым годзе яе распрацоўкі былі ўкаранёны з эканамічным эфектам 30 тыс. рублёў.

ЯКІЯ Ж ШЛЯХІ інтэнсіфікацыі студэнцкай навукі бачыць кафедра, якія фактары могуць садзейнічаць яе прагрэсу?

Ключавым звяном у гэтым з'яўляецца цесная ўзаемасувязь спецыялізацыі кафедры з характарам навукова-даследчай работы і, як вынік гэтага, цесная сувязь усіх дысцыплін з гаспадарча-дагаворнымі работамі. На кафедры пануе думка, што спецкурс павінен быць трыбунай даследчыка, які мае новы навуковы рэзультат. Тады і студэнты пачынаюць генерыраваць свае ідэі. Іменна на спецкурсах прафесара А. С. Міхалёва нараджаліся першыя заяўкі на вынаходніцтвы ў І. Чушанкова і С. Сідарука.

Гаспадарча-дагаворныя работы значна ўплываюць на фарміраванне лабараторнай базы спецпрактыкумаў. Пэўны шэраг новых ідэй матэрыялізаваны ў выглядзе лабараторных макетаў і стэндаў рукамі студэнтаў і ўкаранёны ў вучэбны працэс. Такім чынам пад кіраўніцтвам асістэнта І. А. Шалатоніна быў рэалізаваны лабараторны практыкум па радыёэлектроннаму забеспячэнню робатаў. Лабараторную работу, выкананую ў гэтай лабараторыі, можна разглядаць як некаторую мадэль самастойнага навуковага даследавання.

Галоўным прынцыпам самастойнай работы студэнтаў з'яўляецца давядзенне любой дыдактычнай распрацоўкі (курсавой або дыпломнай) да практычных вынікаў. Калі студэнт пачынае работу з паяльнікам, платай і па заканчэнні некалькіх месяцаў прадстаўляе дзейнічаючы макет, гэта мае вялікае выхаваўчае значэнне. Як правіла, такая работа перарастае далёка за межы курсавой або дыпломнай. Да прыкладу, макет мікрапрацэсарнай сістэмы, створаны Д. Мельнікам, атрымаў высокую ацэнку на Усесаюзным конкурсе студэнцкіх навуковых работ, лабараторны макет В. Любецкага кафедра вылучае для ўдзелу ў міжнароднай выстаўцы.

Цэнтральнае месца ў арганізацыі на кафедры студэнцкай навукі іграе студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя (СНДЛ) робататэхнічных сістэм, якая аб'ядноўвае многіх студэнтаў. Навуковае кіраўніцтва СНДЛ ажыццяўляецца дацэнтам Л. І. Мацюхінай. Людміла Іванаўна з'яўляецца практычна галоўным тэарэтыкам кафедры, валодае адметнай рысай — бачыць за кожнай формулай магчымасць яе практычнай рэалізацыі. Гэтая асаблівасць разам з яе вялікім талентам прыводзяць да таго, што Людмілу Іванаўну нельга сустрэць на кафедры інакш, як у акружэнні студэнтаў і аспірантаў.

Нягледзячы на сваю маладосць, СНДЛ мае ўжо шэраг сур'ёзных дасягненняў: толькі ў мінулым годзе яе распрацоўкі былі ўкаранёны з эканамічным эфектам 30 тысяч рублёў. У лістападзе 1985 года на рэспубліканскай выстаўцы былі прадстаўлены тры экспанаты, у распрацоўцы якіх прымала непасрэдны ўдзел СНДЛ. З 1984 года ўдзельнікамі СНДЛ было зроблена 4 заяўкі на прапануемыя вынаходніцтвы і надрукавана 15 навуковых работ. Ужо традыцыйным стаў удзел нашых студэнтаў ва Усесаюзнай студэнцкай канферэнцыі «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» ў Новасібірску, дзе ў гэтым годзе намі было зроблена 3 даклады (усяго з нашага універсітэта было прынята 7 дакладаў). А даклад І. Заплечнікава быў адзначаны дыпломам лаўрэата.

Аднак у арганізацыі НДРС кафедра сутыкнулася з сур'ёзнымі цяжкасцямі. Наша СНДЛ не мае сваіх плошчаў і студэнты размяшчаюцца ў вучэбных і навуковых лабараторыях. Адчуваецца вялікі дэфіцыт вылічальных магутнасцей. Вылічальная тэхніка, якая ёсць на кафедры, цалкам загружана гаспадарча-дагаворнымі і вучэбнымі работамі, а для НДРС практычна не застаецца машыннага часу.

Гэтыя цяжкасці існуюць не толькі на нашай кафедры. Значыць, настаў час вырашэння гэтых праблем у межах універсітэта.

В. МАЛАФЕЕЎ,
асістэнт.



НА ЗДЫМКУ: парторг кафедры Вячаслаў Міхайлавіч Малафееў.

НА ПЯРЭДНІМ КРАІ

...Каб вынаходніцтва стала нормай, а не выключнай з'явай, важна таксама зацікавіць людзей у стварэнні новага.

# ФОРМУЛА ВЫНАХОДНІЦТВА

Вынаходнік. Так звычайна называюць чалавека, у якога ёсць аўтарскія пасведчанні. Аднак у аднаго іх — 2-3, у іншых — да 300 і больш. Чаму? Як наогул робяцца вынаходніцтвы? Думаецца, што супрацоўнікам кафедры кібернетыкі, якія менш чым за два гады зрабілі 40 заявак на вынаходніцтвы і атрымалі 17 станоўчых рашэнняў, ёсць што сказаць па гэтаму пытанню. І даныя нататкі — спроба выказаць іх агульнае меркаванне.

БЕЗУМОЎНА, асноўную ролю ў працэсе станаўлення вынаходніка адыгрывае калектыў. Калі ў калектыве склалася творчая атмасфера, калі ў кожнага ёсць канкрэтная справа, для паспяховага выканання якой неабходна пераадолець значныя цяжкасці,— новае з'явіцца абавязкова. А каб гэтае новае было іменна вынаходніцтвам, неабходны высокі ўзровень работы калектыву, прафесіяналізм усіх і кожнага, інакш рызыкуеш вынайсці веласіпед.

Інерцыя мыслення — самы галоўны тормаз вынаходніцтва. Безупынная работа па ліквідацыі гэтай інерцыі, пошук нетрывіяльных рашэнняў, погляд на рэчы з іншага боку — вось другая асноўная ўмова вынаходніцтва. Але галоўнае, што патрабуецца ад чалавека, які хоча стаць на ўзровень патрабаванняў, прад'яўляемых да яго ў творчым калектыве,— гэта праца. Без штодзённай працы немагчыма паспяховая вынаходніцкая дзейнасць, як, зразумела, і кожная іншая.

Да ўсяго гэтага, безумоўна, патрэбны некаторыя здольнасці, пэўны агульны ўзровень развіцця. Аднак здольнасці па-за працай слабеюць, між тым як актыўная мэтанакіраваная дзейнасць іх развівае. І іменна велічыня ўкладзенай працы вызначае ў першую чаргу ступень значнасці атрыманага выніку.

Паколькі вынаходніцтва — гэта рашэнне як правіла якой-небудзь тэхнічнай задачы, то зразумела, што колькасць вынаходніцтваў вельмі залежыць ад тэмы, над якой працуе калектыў, ад колькасці праблем. І вынаходніка адрознівае, бадай, уменне першым заўважаць недахопы, знаходзіць нявырашаныя задачы, валоданне крытычным поглядам на рэчы і з'явы.

Пералічанае я б назваў неабходнай крыніцай вынаходніцтва, якая на кафедры кібернетыкі падтрымліваецца стварэннем адпаведнай атмасферы ў калектыве. Гэта задача аблягчаецца як маладосцю супрацоўнікаў, так і перабудовай у нашым грамадстве.

Але каб вынаходніцтва стала нормай, а не выключнай з'явай, важна таксама зацікавіць людзей у стварэнні новага. Генератары ідэй адчуваюць патрэбу і, пераходзячы да радыётэхнічных тэрмінаў, у дапасаванні нагрузак, і ў дастаткова сілкуючым напружанні, і ў экраніраванні ад моцных перашкод. Роля калектыву ў гэтым — галоўная.

Зараз некалькі слоў канкрэтна аб кафедры кібернетыкі. Аўтарамі 18 заявак, пададзеных да 1 верасня 1986 года, з'яўляюцца 8 чалавек, прынамсі, загадчык кафедры прафесар А. Міхалёў уваходзіць у лік аўтараў 12 заявак, аспіранты С. Сідарук і І. Чушанкоў — 10, дацэнт Л. Мацюхіна — 8 заявак. Па станоўчых рашэннях на выдачу аўтарскага пасведчання малюнак некалькі іншы: сярод 11 за гэты год 8 — у І. Чушанкова, 7 — у А. Міхалёва, у астатніх — 4 і менш. Цікава, што адмоў у выдачы аўтарскага пасведчання ў гэтым годзе было ўсяго 3. Пасля іх апратэставання па аднаму з іх было атрымана рашэнне станоўчае, на астатнія адказу пакуль не прыйшло. Па выніках трох апошніх гадоў (з улікам затрымкі разгледжання заявак, дасягаючай 8—9 месяцаў) станоўчыя рашэнні і аўтарскія пасведчанні атрыманы больш чым па 90 працэнтах пададзеных заявак (пры 30 працэнтах у сярэднім па краіне).

На кафедры кібернетыкі шмат рэзерваў пашырэння вынаходніцкай дзейнасці. І галоўны — не збаўляць узятага тэмпу.

І. ЧУШАНКОЎ,
аспірант.





НА ЗДЫМКУ: на пярэднім плане — малодшы навуковы супрацоўнік Сяргей Васільевіч Трухан, на другім плане — загадчык лабараторыі Генадзь Фёдаравіч Астапенка.

НА ЗДЫМКУ: дае тлумачэнні аспірант Сяргей Сідарук.

# Цяжкі толькі пачатак!

СЛОВА ВЫПУСКНІКУ

Успамінаючы гады вучобы ў ВНУ, звычайна прынята гаварыць, што яны праляцелі, як адзін дзень. Не, гэта не так. Для нашага выпуску, час паступлення якога супаў з момантам стварэння кафедры кібернетыкі, кожны год навучання запомніўся сваёй своеасаблівасцю.

*СТВАРЭННЕ РОБАТАЎ — важнейшы напрамак нашай эканамічнай палітыкі. Удзельнічаць у гэтым працэсе ўжо ганарова. І многім з нас, тады студэнтам малодшых курсаў, хацелася прыняць у ім удзел. Мы ведалі аб існаванні кафедры кібернетыкі, ведалі аб пастаўленых перад ёй задачах у галіне робататэхнікі, але, прыходзячы на кафедру, бачылі толькі голыя сцены і пісьмовыя сталы. Вядома, гэта выклікала ў нас разгубленасць і расчараванне. У такой сітуацыі вельмі цяжка было ўтрымацца ад спакусы спецыялізавацца па кафедры радыёфізікі ці кафедры электронных матэматычных машын з іх багатай матэрыяльнай базай і гісторыяй.*

*Дзякуючы загадчыку кафедры А. С. Міхалёву і дацэнту Л. І. Мацюхінай, людзям вялікай захопленасці і высокага прафесіяналізму, на кафедры была створана наша вучэбная група. З першых дзён вучобы стала зразумела, што без глыбокіх ведаў у розных галінах навукі быць спецыялістам па робататэхніцы немагчыма. Стварэнне універсальнага робата — гэта акумуляцыя ў адным прыстасаванні навейшых ідэй з галін электронікі, электратэхнікі, механікі, матэматыкі...*

*З'яўленне на кафедры «жывога» універсальнага робата ўзбагаціла працэс навучання шэрагам «зракавых эмоцый». Можна было гадзінамі стаяць каля працуючага робата і здзіўляцца розуму чалавека і яго энергіі, якія былі ўкладзены ў гэтага «безгалосага» працаўніка.*

*Відаць, сумеснае пераадоленне цяжкасцейператварыла нашу невялікую групу ў з'яднаны, дружны калектыў. Апошні, пяты курс быў карысны самастойнай работай над дыпломным праектам, прычым большая частка распрацовак была даведзена да дзеючых макетаў, практычна годных для выкарыстання ў вучэбным працэсе.*

*Успамінаю свае студэнцкія гады і трошкі зайздрошчу першакурснікам: пашыраецца матэрыяльная і вучэбная база кафедры, удасканальваецца методыка, становяцца разнастайней умовы для студэнцкай навукова-даследчай работы. Таму хачу пажадаць тым, хто прыйдзе на кафедру кібернетыкі, хутчэй і актыўней уключацца ў творчы працэс навуковых даследаванняў, праяўляць самастойнасць і рашучасць пры вырашэнні праблем.*

*І. ЗАПЛЕЧНІКАЎ,*
*выпускнік 1985 года.*

